**Хазанава К.Л. (Гомель)**

# Адлюстраванне духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў у творчасці Максіма Танка

Зварот да народнай культуры ў прагматычны час XX ст. меў і, безумоўна, мае зараз, у XXI ст., выключнае значэнне для духоўнага развіцця грамадства, адраджэння многіх страчаных эстэтычных ідэалаў. Беларуская матэрыяльная і духоўная культура ўяўляе сабой яскравае сведчанне самабытнасці і непаўторнасці нашага народа. Захаваная праз стагоддзі, яна патрабуе асаблівай увагі і клопату, бо мусіць перадацца нашчадкам як свайго роду запавет духоўных і матэрыяльных прынцыпаў існавання. Творчая інтэлігенцыя ў асобах пісьменнікаў, навукоўцаў, настаўнікаў уяўляе сабой захавальнікаў духоўнай і матэрыяльнай культуры народа і “перадавальнікаў” яе будучым пакаленням. Беларускія творцы выкарыстоўвалі і выкарыстоўваць культурныя набыткі народа. Адным з такіх паэтаў быў Максім Танк. Увабраўшы з дзяцінства ў творчую свядомасць народныя традыцыі і абрады, М. Танк уводзіў іх у паэзію.

Ва ўзнёслым лірычным аповедзе аб беларускай восені паэт гаварыў пра традыцыйнасць для восеньскай пары вяселляў: *У беларускую восень Нат і верабей багацее, Лес на грыбы не скуліцца, Пуні хмялеюць ад сена, Мёдам вуллі набракаюць, Сцежкі гараць ад лістоты, Скрыпкі звіняць на* ***вяселлях*** *І маладзіцы дабрэюць – У беларускую восень* [5]. Вясельныя традыцыі беларускага народа перададзены ў многіх вершах М. Танка. Апавядаў паэт пра гаротнасць жыцця беларускай сялянкі ў панскія часы і заўважаў, што сабе на пасаг дзяўчына ткала палотны: *Ткала, ткала я палотны Цэлыя ночы і дні, Ткала ў роднай матулі З лёну свае васмярні.* ***Замуж*** *за Кліма пайшла я. Вечная ў хаце бяда, – Ніва, як палец, вузкая, Ў хлебе цвіла лебяда* [1].

Пра вяселле М. Танк больш дэталёва прыгадаў у вершы аб нешчаслівым каханні “Што ж ты клічаш на вяселле?”: тут і абавязковыя на вяселлі спевы і танцы, і традыцыйны пачастунак гарэлкай, і, канешне, атрыбуты, без якіх немагчыма ўявіць беларускае вяселле – вэлюм і каравай: *Што ж ты клічаш на* ***вяселле****? Ці жартуеш, ці не знаеш, Што калі прыйду, дык буду Не спускаць з цябе пагляду, Калі* ***песню*** *хто зацягне, Сцяўшы зубы, прамаўчу я. Калі ў* ***танцы*** *цябе стрэчу, Дык не выпушчу з абдымкаў.* ***Караваем*** *пачастуеш – Ён калом у горле стане. А* ***гарэлкі*** *паднясеш мне – Што ж, знай, вып’ю я за тое, Каб твой* ***вэлюм*** *стаў як ночка* [5].

Неабходна заўважыць, што з традыцыяй каравая на беларускім вяселлі звязана дастатковая колькасць рытуалаў. Пачэсную справу выпечкі вясельнага каравая давяраюць не кожнаму. Этнаграфічныя крыніцы сведчаць: *Пякла каравай хросная мама* (в. Жмураўка Рэч.); *Каравай пеклі з*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*цёмнай ржаной мукі, абязательна свяцілі вадой. Пяклі два каравая. Адзін каравай – у маладой, а другі – у маладога* (в. Азершчына Рэч.); *Каравай пякла альбо родная, або хросная маці* (г. Ветка); *Каравай пяклі радзіцелі нявесты* (в. Хальч Ветк.) [3]; *Пяклі каравай у асноўным толькі старыя жанчыны* [2, с. 253]. Жанчыны, якія выпякалі каравай, называлі *каравайніцы* [1, с. 24]: *Эта нада, штоб булі яны не развядзёныя, штоб не ўдовы, штоб жылі хораша, гэта каб маладыя харашо жылі* [4, с. 119]. Спецыяльныя парады існавалі для вытворчасці каравая: *Рашчыняюць каравай няцотная колькасць жанчын, якія добра жывуць у пары* [1, с. 308]; *Рашчыняюць каравай – спяюць, замесяць – спяюць. Така лапата була, на лапату яго кладуць, украшаюць і бублікі розныя дзелаюць і абараначкі ўсе, так, штоб ён ужэ быў красівы й нарадны* (г. Ветка) [3]. Каравай звычайна свяцілі: *Каравай гатавалі к свадзьбе ў печцы, свяцілі абязацельна вадзічкай святой, выпякалі з мукі, яечак, смятаны, бывала, што і сахару ні было* (в. Азершчына Рэч.) [3]. Падчас вяселля каравай бласлаўлялі: *Сват бярэ каравай у рукі, паднімае над галавой і нясе. Ставіць перад маладымі. Кажучы: “Айцец і маці, благаславіце каравай пачаці*” [2, с. 253]. У народнай абраднасці захаваліся цікавыя традыцыі, звязаныя з першым адрэзаным кавалкам каравая: *Первый кусок адразалі нявесце і жаніху* (в. Жмураўка Рэч.) [3].

Далейшы падзел каравая таксама меў адметнасці: *Каравай рэзалі сваты – два-тры мужчыны. Першы рэзаў, другі чарку наліваў, трэці – падаваў* (в. Церуха Гом.); *Кросны з кроснай дзялілі каравай, а перад етым нада шчэ яго выкупіць. Давалі грошы, хто сколькі можа* (в. Азершчына Рэч.)*; Паздравяць маладых, тады выносілі каравай, дзялілі яго кум і кума* (в. Азершчына Рэч.). Беларускі вясельны каравай асабліва ўпрыгожваўся: *Упрыгожванні: тры птушкі, тры месяцы, тры кветкі. Каравай ложаць на абрус, на які сыпляць зерне аўса або пшаніцы, а сам каравай абвязваюць ручніком* [1, с. 30].

У старажытнасці ўсходнія славяне пачыналі новы год вясной, калі абуджаецца і аднаўляецца прырода. Матыў гукання вясны стаў пачаткам знакамітага верша Максіма Танка: *Паслухайце, вясна ідзе. Звініць ў маім акне жалеза. З вінтоўкай стражнік ноч і дзень Пільнуе куст пахучы бэзу* (Паслухайце, вясна ідзе”) [5]. М. Танк добра ведаў народную беларускую паэзію і абраднасць беларускага народа. Паэт нават стварыў уласную вяснянку ў вершы “Вясна-красна на ўвесь свет”, дзе ўспомніў і пра традыцыі беларускага валачобніцтва, і пра купальскія вянкі: *Мінулі завеі, панурыя дні; Гараць на усходзе зарніцаў агні. Вясна-красна на ўвесь свет! Іду валачобнікам я па зямлі, Вітаю вясну, што прыйшла на палі. Вясна-красна на ўвесь свет! Спяшайся, вясна, і маўчанне зімы Вятрамі, дажджамі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*грымучымі змый. Вясна-красна на ўвесь свет! Будзі жаўрукамі жытнёвую рунь, Палі незгасальную ў небе зару. Вясна-красна на ўвесь свет! Дай буйную завязь цяністым садам, Спакойныя хвалі купальскім вянкам. Вясна-красна на ўвесь свет! А мне памажы скласці гэткі напеў, Каб век ён у сэрцы народа звінеў. Вясна-красна на ўвесь свет!* [5].

Традыцыі радасці прывітання вясны адзначаюцца ў вершах М. Танка для дзяцей: *Як вясна прышла ў гаі, Разбудзіла ручаі І паклікала ізноў Птушак з выраю дамоў* (“Як вясна прыйшла”) [5]; *Ірынцы спадабалася Цудоўная вясна. Як восені даждалася, Пайшла прасіць яна. Прасіла яна шчыра так, Прасіла ўсю зіму, І мо' вясна аж з выраю Вярнулася таму* (“Ірынка”) [5].

М. Танк успамінаў пра традыцыйныя жанры беларускай вуснай народнай творчасці: *У* ***казках, думах*** *песняроў Была ты* [Беларусь], *часам, сірацінай* (“Беларусь”) [5], і сам стварыў калыханкі: *Пачала кума-варона* ***Калыханку*** *напяваць* (“Калыханка”) [5], апяваў старажытных народных пацешнікаў-скамарохаў: *Здарожыўшыся,* ***скамарох*** *Аднойчы заснуў на аселіцы* (“Зарапад”) [5] і паводле лепшых фальклорных узораў стварыў метафарычныя малюнкі зорнага неба: *Ланцуг перагрызла* ***Мядзведзіца****. І Млечным Шляхам з сяла Праз нашу краіну азёрную, Прытопваючы, пайшла Збіраць медзякі зорныя* (“Зарапад”) [5], ухваляў пошукі лепшай долі: *Гнуцца, матуля, не будзем Больш у паноў за сярпом, ясную* ***долю*** *здабудзем* (“Ткала, ткала я палотны”) [5] і выказваў традыцыйную для ўсходніх славян пашану хлебу: *І Хлебу нізкі, да зямлі, Аддаў паклон, як брату* (“Хлеб”) [5].

Такім чынам, М. Танк адлюстраваў шматлікія элементы духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа. Праз прызму ўласнага творчага светаразумення паэт стварыў асаблівы прыклад асэнсавання народных каранёў і вытокаў, даўшы ўзор захавання родных традыцый нашчадкам.

Прынятыя скарачэнні

Ветк. – Веткаўскі раён Гомельскай вобласці;

Гом. – Гомельскі раён Гомельскай вобласці;

Рэч. – Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці;

Літаратура

1. Вяселле на Гомельшчыне : фальклорна-этнаграфічны зборнік ; рэд. І.Ф. Штэйнер, В.С. Новак. – Мінск : Нёман, 2003. – 472 с.

2. Зямля чароўная дабра: Добрушскі край: гісторыя і сучаснасць ; пад аг. рэд. А.А. Станкевіч. – Гомель : Полеспечать, 2008. – 280 с.

3. Картатэка лінгвістычнай лабараторыі кафедры беларускай мовы УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Народная духоўная культура Брагіншчыны : фальклорна-этнаграфічны зборнік ; склад. В.С. Новак, У.І. Коваль. – Гомель : Белдрук, 2007. – 240 с.
5. Танк, М. Вершы [Эл. рэсурс]. – Рэжым доступу : http:/maksimtank.ru/vershy. – Дата доступу : 31.05.2012.
6. Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна ; аўт.-уклад. І.Ф. Штэйнер, В.С. Новак. – Мінск : Нёман, 2002. – 383 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ